https://nashaniva.com/ru/246685

Армада расійскіх ботаў неадступна ходзіць за Ціханоўскай

Пад любыя пасты Святланы Ціханоўскай ці пра яе ў сацыяльных сетках адразу набягаюць галаслівыя боты. Феерычны перапіс іх адбыўся і пад віншаваннямі Святланы з Днём нараджэння. Мы прааналізавалі, хто гэтыя персанажы.

11 верасня Святлана Ціханоўская адзначыла 44-ы дзень нараджэння. Як і любы сучасны чалавек, яна з гэтай нагоды атрымала віншаванні ў тым ліку праз сацыяльныя сеткі. Аднак не да кожнага чалавека ў такія пасты прыходзіць столькі хейтараў.

Дзясяткі абразлівых каментароў напісаныя па-руску і па-англійску. Пры гэтым сотні каментароў дзіўна падобныя. Мы паглядзелі, якія ўстаноўкі прасоўваюць гэтыя акаўнты і як ствараецца ўражанне міжнароднай хвалі нянавісці да чалавека, за якога беларусы прагаласавалі ў 2020-м.

Боты маюць устаноўку навязваць вобраз Ціханоўскай як некампетэнтнай, непадрыхтаванай асобы, самазванага лідара. Яе называюць «кухаркай», «самазванкай», «бамжом», «клоунам» і «прэзідэнтам кухні» — і па-англійску «Kitchen President».

Месэджы ботаў перасякаюцца з той ідэяй, якую апошнім часам добразычліўцы настойліва падкідваюць і Сяргею Ціханоўскаму: што сапраўдны лідар быў ён, а Святлана — выпадковая і непрыстасаваная да лідарства асоба.

Звяртае ўвагу і геаграфія «каментатараў». Так, раптам беларускай палітыкай масава цікавяцца акаўнты, нібыта звязаныя з Малдовай і Балгарыяй. А «жыхары» англамоўных краін пішуць на рускай мове.

На вялікай і магутнай пішуць грэкі, каментуюць і грузіны з імёнамі па-руску.

Боты, як заўсёды, лайкаюць суседнія каменты.

Звычайна фэйсбук паказвае допісы абмежаванаму колу людзей. Але пад віншаваннем дарадцы Святланы Ціханоўскай Франака Вячоркі назбіралася больш за 2000 каментароў.

Геаграфія «зацікаўленых» тут пашыраецца да Літвы, Латвіі, Канады і ЗША, а сярод каментароў становіцца больш англійскай.

Але змест той самы на ўсіх мовах:

«Хто гэта?», «Несапраўдны прэзідэнт», «Ты што, абкураны?», «Прэзідэнт чаго?», «Прэзідэнт кухні».

Пра тое, што запісы пакідаюць не сапраўдныя карыстальнікі сведчыць аналіз іх профіляў. Большасць старонак такіх «карыстальнікаў» не мае здымкаў або гэтыя здымкі настолькі

агульныя, што цяжка гарантаваць іх сапраўднасць. Большасць акаўнтаў маюць мінімум сяброў, мінімум або нуль запісаў у сваіх адкрытых профілях. Пры гэтым яны знаходзяць пасты з віншаваннямі Ціханоўскай і пакідаюць пад імі аднатыпныя каментары.

Набор установак:

«А дзе Сярожа!?», «Такога цуду ў гісторыі, напэўна, яшчэ не было — каб чалавека, які жыве за межамі краіны, называлі прэзідэнтам гэтай краіны. Гэта называецца трызненнем сівой кабылы», «Дык пяцігадовы тэрмін пасля тых выбараў ужо даўно скончыўся».

Сярод каментатараў абавязкова ёсць і «простыя ўкраінкі» з закрытым профілем, якія асуджаюць вайну, «развязаную англа-амерык. рукамі».

Тое самае назіраецца і ў тыктоку, і ў інстаграме, і ў ютубе. Для атак на Ціханоўскую недастаткова акаўнтаў, якія выдаюць сябе за звычайных беларусаў. «Геаграфія» ўсюды значна шырэйшая.

Ціханоўская яшчэ ў пачатку лютага пераехала з Вільні ў Варшаву, аднак каментатары па-ранейшаму «прывязваюць» яе да Літвы.

Адзін называе яе «прэзідэнтам Літвы», другі — «прэзідэнтам аб’яднаных кухняў, прызнаным бананавай дзяржавай Літвой».

Выглядае так, нібы набор установак не абнаўлялі з тых часоў, калі Ціханоўская працавала ў Вільні.

У некаторых выканаўцаў Літва ператвараецца ў Латвію. Характэрна, што Беларусь пры гэтым называюць расійскім варыянтам «Белоруссия».

Наўрад ці мінская прапаганда мае сваю настолькі разгалінаваную міжнародную сетку ботаў. Значна больш імаверна, што для кампаніі задзейнічаныя расійскія ботафермы. Яны выкарыстоўваюць свой поўны набор акаўнтаў — ад «літоўцаў» і «малдаванаў» да «амерыканцаў» і «канадцаў».

Мяркуючы па рэсурсах, якія трацяцца на дыскрэдытацыю Святланы Ціханоўскай і яе атачэння, яна па-ранейшаму разглядаецца Масквой і Мінскам як пагроза легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі і сур'ёзны праціўнік.

Цяпер чытаюць

У перамовах з Коўлам гэтым разам бярэ ўдзел і Турчын. З амерыканскага боку Сміт змяніўся на Паніка[10](https://nashaniva.com/404678/comments)

У перамовах з Коўлам гэтым разам бярэ ўдзел і Турчын. З амерыканскага боку Сміт змяніўся на Паніка

Электронную «Беларускую энцыклапедыю», створаную як прастору «верагодных ведаў пра Беларусь», ціха ліквідавалі разам з рэдакцыяй. Купу артыкулаў перадалі Гігіну[5](https://nashaniva.com/404625#startcomments)[5](https://nashaniva.com/404625/comments)

Электронную «Беларускую энцыклапедыю», створаную як прастору «верагодных ведаў пра Беларусь», ціха ліквідавалі разам з рэдакцыяй. Купу артыкулаў перадалі Гігіну[5](https://nashaniva.com/404625#startcomments)

[Усе навіны →](https://nashaniva.com/articles/)

Каментары38